УДК 27(476)

*А. М. Калыска, 5 курс*
*Навуковы кіраўнік: С. В. Венідзіктаў,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*часова выконваючы абавязкі па пасадзе*
*начальніка кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС (Беларусь)*

# ПРАВАСЛАЎЕ Ў РЭЛІГІЙНЫМ АДРАДЖЭННІ БЕЛАРУСІ Ў ПОСТСАВЕЦКІ ПЕРЫЯД

*У артыкуле разглядаецца роля і месца праваслаўя ў рэлігійным жыцці сучаснай Беларусі, прыводзіцца структурна-функцыянальная характарыстыка Беларускага Экзархата, аналізуюцца прычыны нізкай рэлігійнасці ў грамадстве.*

Рэлігійная дзейнасць усіх канфесій у Беларусі асабліва актывізавалася ў канцы 1980-х гг., пра што сведчаць сацыялагічныя даследаванні. У 1989 г. да ліку атэістаў адносілі сябе 65 % апытаных, у 1994 г. іх налічвалася толькі 32 %. Значна павялічылася колькасць вернікаў – з 22 % у 1989 г. да 43,4 % у 1994 г. Пры гэтым рэлігійнасць сярод жанчын была вышэй, чым сярод мужчын (54,6 % супраць 33,3 %). У старэйшых узроставых групах доля вернікаў сярод жанчын была ў 1,5–2 разы вышэй, чым сярод мужчын. Паводле даследавання цэнтра Gallup, толькі 27 % грамадзян Рэспублікі прызналі, што рэлігія адыгрывае важную ролю ў паўсядзённым жыцці. Па гэтым паказчыку Беларусь уваходзіць у лік 11 найменш рэлігійных краін свету.

Вядучае месца ў рэлігійным жыцці краіны займае праваслаўе. У кастрычніку 1989 г. у адпаведнасці з рашэннем Архіерэйскага Сабору Рускай Праваслаўнай Царквы, быў утвораны Беларускі Экзархат (Беларуская Праваслаўная Царква). У кананічных адносінах Беларускі Экзархат – гэта адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка Рускай Праваслаўнай Царквы, якая аб’ядноўвае епархіі з іх благачыннымі, прыходамі, кляштарамі, духоўнымі навучальнымі ўстановамі, якія знаходзяцца ў межах Рэспублікі Беларусь. Кіраванне Беларускім Экзархатам ажыццяўляе Патрыяршы Экзарх, які адначасова з’яўляецца кіруючым архіерэем Мінскай епархіі і кіраўніком Мінскай мітраполіі.

Вышэйшая заканадаўчая, выканаўчая і судовая ўлада ў Беларускім Экзархаце належыць Сіноду, які ўзначальваецца Экзархам Патрыяршым. Сінод Беларускага Экзархата абірае і прапануе на зацвярджэнне Святога Сінода РПЦ кіруючых і вікарных архіерэяў у межах Экзархата; накіроўвае архіерэяў Экзархата для ўдзелу ў працы Святога Сінода РПЦ у якасці часовых членаў; зацвярджае на пасады настаяцеляў і ігуменаў манастыроў, якія знаходзяцца ў

межах Экзархата; вырашае багаслоўскія, літургічныя, дысцыплінарныя, пастырскія і царкоўна-адміністрацыйныя пытанні, якія маюць рэгіянальнае значэнне; каардынуе дабрачынную, сацыяльную і міратворчую дзейнасць дыяцэзій, якія ўваходзяць у склад Беларускага Экзархата. У неабходных выпадках Экзарх ажыццяўляе паўнамоцнае прадстаўніцтва перад дзяржаўнымі ўладамі Беларусі па ўсіх пытаннях, якія тычацца дзейнасці Экзархата.

Да часу ўтварэння Беларускага Экзархата ў яго складзе было 4 епархіі (Мінская, Полацкая, Магілёўская і Пінская). На пачатку 2015 г. у беларускім Экзархаце было 14 дыяцэзій: Мінская і Заслаўская; Полацкая і Глыбоцкая; Пінская і Лунінецкая; Магілёўская і Мсціслаўская; Брэсцкая і Кобрынская; Гомельская і Жлобінская; Навагрудская і Слонімская; Гродзенская і Ваўкавыская; Тураўская і Мазырская; Віцебская і Аршанская; Барысаўская і Мар’інагорская; Слуцкая і Салігорская; Маладзечанская і Стаўбцоўская; Лідская і Смаргонская, а таксама Дзятлаўскае вікарыяцтва Навагрудскай епархіі. У Беларускім Экзархаце на пачатак 2015 г. налічвалася 1612 царкоўных прыходаў з правам юрыдычнай асобы і 35 манастыроў. Сваё служэнне здзяйснялі 15 архіерэяў, 1691 святар, 216 дыяканаў, 432 законнікі і манахі. Праводзілася вучэбная падрыхтоўка ў Мінскай духоўнай акадэміі, у 2 духоўных семінарыях, інстытуце тэалогіі Белдзяржуніверсітэта, у 4 духоўных вучылішчах. Галоўная кафедра Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Паўла знаходзіцца ў Мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы.

У 2003 г. паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквой было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве, рэалізацыя якога стала прыкладам сумеснай працы дзяржавы і царквы на карысць грамадства. Дзяржава і Царква прызнаюць, што прыярытэтнымі напрамкамі іх супрацоўніцтва з’яўляюцца грамадская маральнасць, выхаванне і адукацыя, культура і творчая дзейнасць, ахова, аднаўленне і развіццё гістарычнай і культурнай спадчыны, ахова здароўя, сацыяльнае забеспячэнне, міласэрнасць, дабрачыннасць, падтрымка інстытута сям’і, мацярынства і дзяцінства, апека над асобамі, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі, выхаваўчая, сацыяльная і псіхалагічная праца з вайскоўцамі, ахова навакольнага асяроддзя.

Важным аспектам разумення інтэнсіўнасці і дынамікі рэлігійнасці ў Беларусі з’яўляецца яе залежнасць і ад сацыяльных настрояў беларусаў. Пра сваю глыбокую рэлігійнасць заявілі 4,2 % прыхільнікаў праваслаўя, 10,2 % – каталіцызму і 75 % – царквы ЕХБ (евангельскіх хрысціян баптыстаў). Сярод тых, хто адносіць сябе да праваслаўных, 27,7 % перакананыя, што галоўная задача рэлігіі заключаецца ў тым, каб дапамагаць людзям у дасягненні вышэйшага шчасця (г. зн. вечнага шчасця пасля смерці); сярод католікаў так думаюць 39,4 %, а сярод прыхільнікаў царквы ЕХБ – 90,5 %.

Вялікі ўплыў на рост рэлігійнасці аказвае індывідуальная рэакцыя людзей на паўсядзённыя праявы чалавечай бездухоўнасці, а таксама крызіс звыклых каштоўнасцей. Унутраны свет людзей патрабуе кампенсацыі і абароны, знайсці якія, як высвятляе суб'ектыўны вопыт многіх, можна ў рэлігіі.Часта ўспрыманне праблем новага грамадскага жыцця падахвочвае людзей звяртаць свае погляды ў бок рэлігіі. Крах многіх грамадскіх ілюзій, масавая фрустрацыя служаць добрай асновай для вялікай цікавасці да рэлігіі. Сёння кожнаму трэцяму з апытаных уласціва перакананне ў тым, што чалавеку трэба ў што-небудзь ці ў каго-небудзь верыць.

Перамены ў разуменні сэнсу і месца царкоўнага жыцця ў чалавечым свеце несумненна адбіліся на характары дзейнасці і абліччы самой царквы, якая ўсё часцей звяртаецца да свецкага вопыту. У Беларусі створана прававое поле, у якім рэлігійныя арганізацыі могуць паўнавартасна дзейнічаць і развівацца. Пры гэтым дзяржава не ўмешваецца ў пытанні веравызнання той ці іншай рэлігіі, а кантроль за дзейнасцю рэлігійных арганізацый абмяжоўваецца сферай выканання імі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.